# КРЭЎСКАЯ ЎНІЯ 1385 ГОДА

**А. І. Голубева**

1. Сярод прычын Крэўскай уніі можна вылучыць прычыны ў знешнепалітычнай сферы і прычыны ва ўнутрыпалітычным становішчы ў Вялікім Княстве Літоўскім і ў Польшчы. Самай відавочнай прычынай Крэўскай уніі з'яўлялася наяўнасць агульнага ворага – нямецкіх крыжаносцаў. На існаванне такой прычыны звяртае ўвагу большасць даследчыкаў (У. Арлоў, А. Вішнеўскі, М. Ермаловіч, І. Лапо, П. Лойка, С. Платонаў, Г. Сагановіч, С. Цярохін, І. Юхо і іншыя).

Напярэдадні заключэння Крэўскай уніі ў 1382 годзе Ягайла ўсталяваў мір з Масквой. Аднак Маскоўская дзяржава ў той час набірала моц і прэтэндавала на асобныя землі, таму саюз з Польшчай быў выгадны Вялікаму Княству Літоўскаму. На пагрозу з боку Маскоўскай дзяржавы як на прычыну Крэўскага пагаднення звяртаюць увагу А. Вішнеўскі, М. Ермаловіч, С. Цярохін і іншыя.

Адносіны паміж Вялікім Княствам Літоўскім і Польшчай таксама спрыялі заключэнню ўніі. Ваенныя сутычкі адбываліся пастаянна, вяліся войны з пераменным поспехам. Бакі маглі вырашыць застарэлае пытанне аб Галіцка-Валынскай Русі. Польшча імкнулася далучыць да сваёй тэрыторыі Валынь, Падолію і Галіцкую Русь, а Вялікае Княства Літоўскае – вырашыць гэта пытанне на сваю карысць. Адносіны паміж Вялікім Княствам Літоўскім і Польшчай у якасці прычыны заключэння Крэўскай уніі вылучаюць такія беларускія даследчыкі, як А. Вішнеўскі, М. Ермаловіч, С. Цярохін, І. Юхо. Некаторыя расійскія даследчыкі ў гэтым бачаць галоўную прычыну Крэўскай дамовы.

Палітычны крызіс у Вялікім княстве Літоўскім у якасці прычыны Крэўскай уніі вылучаюць У. Арлоў, М. Ермаловіч, У. Ігнатоўскі, П. Лойка, Г. Сагановіч.

У. Арлоў, У. Ігнатоўскі, П. Лойка, Г. Сагановіч і іншыя беларускія даследчыкі звяртаюць увагу на імкненне палякаў заключыць унію з Вялікім Княствам з-за сваіх карысных інтарэсаў.

2. Акт Крэўскай уніі быў падпісаны 14 жніўня 1385 года ў замку Крэва (мястэчка Смаргонскага раёна на Гродзеншчыне). Гэтым актам упер-

шыню былі замацаваны саюзныя адносіны паміж Вялікім Княствам Літоўскім і Польшчай.

3. Выконваючы свае абавязкі паводле ўмоў Крэўскай уніі, Ягайла ў 1387 годзе выдаў тры прывілеі, два з якіх былі накіраваны на распаўсюджванне каталіцызму ў Вялікім Княстве Літоўскім. Прывілеі Ягайлы замацоўвалі вынікі Крэўскай уніі 1385 года. Па-першае, яны спрыялі ўмацаванню становішча каталіцкай царквы, якая паступова набыла велізарную эканамічную моц і стала самай уплывовай палітычнай сілай у дзяржаве. Па-другое, прывілеі ставілі праваслаўную знаць, якая ў большасці паходзіла з беларускіх і ўкраінскіх земляў, у няроўнае эканамічнае становішча з феадаламі-каталікамі, бо на праваслаўных прывілеі не распаўсюджваліся. Гэта выклікала пераход у каталіцызм многіх феадалаў Вялікага Княства Літоўскага. Пачалося акаталічванне большасці насельніцтва Княства. На гэту з'яву як на вынік Крэўскай уніі звяртаюць увагу многія даследчыкі: І. Бяляеў, М. Ермаловіч, Д. Ілавайскі, П. Лойка, В. Чаропка, І. Юхо і іншыя. Адначасова прывілеі выклікалі незадавальненне праваслаўнай часткі насельніцтва Вялікага Княства Літоўскага. Прывілеем ад 28 красавіка 1387 г. адначасова падкрэслівалася адасобленасць Вялікага княства Літоўскага ад Польшчы (а гэта абвяргае вывад аб тым, што Крэўская ўнія азначала інкарпарацыю Вялікага Княства ў Польшчу).

Адным з вынікаў Крэўскай уніі 1385 года стала ўзнікненне апазіцыі Крэўскай уніі і палітыцы Ягайлы. Гэта прывяло да таго, што ўмовы Крэўскай уніі былі выкананы не поўнасцю. Была створана канфедэрацыя Вялікага Княства Літоўскага і Польшчы. Вялікае Княства захавала сваю самастойнасць, а ўнія не набыла трывалы характар і на працягу XV – XVI стагоддзяў больш за дзесяць разоў пацвярджалася.

Апазіцыя Крэўскай уніі ўзнікла ў Вялікім Княстве Літоўскім па наступных прычынах. Па-першае, пасля заключэння ўніі і каранацыі Ягайлы ў Кракаве з усіх літоўска-рускіх князёў была ўзята прысяга на вернасць каралю, каралеве і Польшчы. Надзельныя князі станавіліся васаламі Польшчы і гублялі сваю самастойнасць. Па-другое, пасля выдання прывілеяў Ягайлы 1387 года праваслаўныя феадалы былі пастаўлены ў прыніжанае становішча ў параўнанні з феадаламі-каталікамі. Такія ўмовы Крэўскай уніі былі на карысць толькі польскім феадалам, таму не задаволілі ні літоўскіх, ні рускіх феадалаў. Знаць Вялікага Княства не хацела мірыцца са стратай дзяржавай самастойнасці і з палітыкай акаталічвання насельніцтва. Так узнік грамадска-палітычны рух, накіраваны супраць Крэўскай уніі і пракаталіцкай палітыкі Ягайлы.

Праз некалькі гадоў супраць Крэўскай уніі выступіў і князь Вітаўт. Ён быў асабіста незадаволены тым, што Ягайла, будучы польскім каралём, паставіў сваім наменснікам у Вялікім Княстве Літоўскім не яго, а Скіргайлу. Выкарыстаўшы варожасць грамадства Вялікага Княства да Крэўскай уніі, Вітаўт пачаў барацьбу з Ягайлам. Гэта барацьба працягвалася з 1389 па 1392 год і была накіравана на адстойванне дзяржаўнага суверэнітэту Вялікага Княства Літоўскага. Вітаўт выступіў з праграмай стварэння самастойнага "Руска-Літоўскага каралеўства, якое супраць стала б з аднаго боку Польшчы, а з другога – Масквы". У 1390 годзе Вітаўт, спадзеючыся на дапамогу Масквы, дзе яго лічылі сур'ёзнай палітычнай фігурай, выдаў сваю дачку за князя Васілія Дзмітрыевіча. Заключыўшы саюз з крыжакамі, у 1390 – 1393 гг. Вітаўт неаднаразова з імі рабіў паходы на сваю радзіму. Хаця спробы захапіць Вільню скончыліся няўдачай, Вітаўту ўдалося заняць шэраг гарадоў, у тым ліку Гародню. За дапамогу ён абяцаў Лівонскаму ордэну Жамойцію. Пагроза ўладзе Ягайлы ў Вялікім Княстве была вялікай. Існавала рэальная небяспека разрыву ўніі. Тады Ягайла вырашыў ахвяраваць уладай над Княствам, каб захаваць саюз абедзвюх дзяржаў і каралеўскі трон у Кракаве.

Трохгадовая крывавая барацьба Вітаўта і Ягайлы завяршылася падпісаннем пагаднення паміж імі ў маёнтку Вострава каля Ліды 5 жніўня 1392 года. Паводле Востраўскага пагаднення аслабілася прымусовае акаталічванне, асабліва ў этнаграфічнай Літве, дзе хрышчэнне праводзілася пасля 1413 года; не дапускалася ўтрыманне польскіх салдат у беларускіх і літоўскіх гарадах. Вялікі князь Скіргайла, які скампраментаваў сябе супрацоўніцтвам з польскімі феадаламі, здымаўся з Вялікага Княства і пераводзіўся на Княства Кіеўскае. Паўнамоцтвы Вялікага князя літоўскага перадаваліся брэсцкаму і гродзенскаму князю Вітаўту, якому былі вернуты ўсе спадчынныя ўладанні: Трокі, Гародня, Бярэсце і Луцкая зямля. Аднак і Вітаўт прызнаў вяршэнства асабовай улады Ягайлы, даў клятву быць верным каралю, каралеве і Польшчы.

Такім, чынам, Востраўскім пагадненнем былі юрыдычна афармлены тыя фактычныя ўзаемаадносіны, што склаліся паміж Вялікім Княствам Літоўскім і Польшчай пасля ўступлення Ягайлы на польскі прастол. Вялікаму Княству было гарантавана адасобленае дзяржаўнае існаванне, але ў саюзе з Польшчай. Інкарпарацыя Вялікага Княства Літоўскага ў Польшчу не адбылася, саюз Літвы і Польшчы застаўся фактычна саюзам дзвюх раўнапраўных дзяржаў, і Вялікае Княства ў непарушнасці захавала сваю дзяржаўнасць, суверэнітэт, толькі паступова засвойваючы некаторыя польскія дзяржаўныя інстытуты і юрыдычныя нормы, прымальныя для мясцовага насельніцтва.

Уступленне Ягайлы на польскі прастол вельмі змяніла знешнюю і ўнутраную палітыку Польшчы. Ягайла, які вырас і выхоўваўся ў Беларусі, прыбыў у Кракаў з вялізнай світай сваіх прыдворных і асабістай аховай, набранай у асноўным з яго ўладанняў у Беларусі. Паколькі ні сам Ягайла, ні яго прыдворныя і ахова не размаўлялі ні на лацінскай, ні на нямецкай мове, то і польскія феадалы былі вымушаны пакінуць нямецкую і пераходзіць на беларускую або польскую мову. Такім чынам, пры каралеўскім двары быў зроблены пачатак адраджэння славянскай мовы і абмежавання нямецкай. Абапіраючыся на свае ўзброеныя атрады, Ягайла ўмацаваў каралеўскую ўладу ў Польшчы і тым самым часткова абмежаваў самавольства буйных феадалаў і ўплыў вярхоў каталіцкага духавенства на дзяржаўныя справы.

Аддаленыя вынікі Крэўскай уніі – гэта даволі трывалы дзяржаўны саюз Вялікага княства Літоўскага і Поль на працягу XIV – XVI стагоддзяў, да заключэння Люблінскай уніі 1569 года, паступовае збліжэнне дзяржаўных інстытутаў Вялікага княства і Польшчы, а таксама культурнае збліжэнне вярхоў грамадства.

Крэўская унія ў цэлым спрыяла развіццю Вялікага княства Літоўскага і Польшчы. Дзякуючы саюзу ўдалося ліквідаваць пагрозу з боку Тэўтонскага ордэна, перамагчы яго ў Грунвальдскай бітве 1410 года, адкрыць гандлёвыя шляхі ў Заходнюю Еўропу. На ўсходзе Вялікаму Княству з дапамогай Польшчы ўдалося стрымліваць націск з боку Маскоўскай дзяржавы. Адным з вынікаў уніі быў шырокі дыпламатычны выхад Вялікага Княства Літоўскага ў Еўропу, а таксама культурнае збліжэнне з іншымі краінамі Еўропы.